АНТАЛОГІЯ АШУКАНСТВА

Асцярожна: кавуны!

Гэтая смачная ягада так і вабіць сваёй яркай мякаццю з вулічных прылаўкаў. Нядаўна не ўтрымалася і купіла чацвярцінку вагой амаль шэсць кіло. Аддала сем рублёў і ніколькі не пашкадавала — смаката! Але Вячаслаў Гурскі адкрыў мне вочы.

— Гэта добра, што ўсё скончылася без наступстваў, — строга адзначыў ён. — Па-першае, прадаваць кавуны ў разрэзаным выглядзе катэгарычна забаронена, нават калі ёсць умовы для іх мыцця. Па-другое, сама лупіна гэтага прадукту выступае як транспартная ўпакоўка — кавун і на зямлі ляжыць, і едзе незразумела як, і прадаецца не ў стэрыльных умовах. Не факт, што яго, перад тым як разрэзалі, памылі. А мякаць кавуна — цудоўнае асяроддзе для росту і размнажэння мікраарганізмаў, асабліва ў цёплае надвор'е. На спякоце на працягу дзвюх гадзін у сотні разоў павялічваецца колькасць мікраарганізмаў і адпаведна іх таксінаў. Пакуль чалавек данясе гэты кавун да дому, зараза можа распаўсюдзіцца па ўсёй мякаці. Каго мы толькі на паверхні кавуноў не знаходзілі — і сальманел, і стафілакокавых бактэрый, і іншыя не менш небяспечных мікраарганізмаў. Асабліва рызыкуюць пажылыя людзі, дзеці і тыя, у каго аслаблены імунітэт. Мы адсочваем сітуацыю, прыцягваем вінаватых да адказнасці, але гандлёвых пунктаў шмат, да кожнага не прыставіш правяраючага. Ідзе сістэмная работа, але парушэнняў хапае. Часта яны звязаны яшчэ і з тым, што рэалізацыя ажыццяўляецца без дакументаў аб якасці і бяспецы. Калі мы не можам праверыць канал паставак, здымаем тавар з рэалізацыі.

— *Можа, тут нешта не так? Вядома ж, што кавуны паспяваюць бліжэй да восені,* — цікаўлюся ў спецыяліста.

— У чэрвені правяралі на прысутнасць нітратаў і кавуны з дынямі, і кабачкі з бульбай, іншую сезонную гародніну — усё ў норме. Да якасці прэтэнзій няма. Проста кавуны растуць у розных кліматычных зонах — у чэрвені прыязджаюць да нас з Казахстана, потым ідуць Узбекістан, Таджыкістан, бліжэй да восені Украіна. Усе яны розныя па складзе, форме, выглядзе. Сапраўды, калі нехта купіў бледны варыянт з той жа Украіны і параўноўвае з чырвоным з Казахстана, у яго складваецца ўражанне, што дзесьці падманулі. Але гэта не так. Нават з адной кліматычнай зоны кавуны бываюць розныя — тут усё залежыць ад сорту, часу пасадкі, дагляду. Усе кавуны, якія прыязджаюць да нас, праходзяць лабараторны кантроль і атрымліваюць дакументы аб якасці і бяспецы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Грыбы з ягадамі таксама бываюць розныя

Асабліва прывабна гэты тавар выглядае ў выпадковых гандляроў. У так званых дачнікаў або бабулек, якія клянуцца, што ў іх усё чысценькае, толькі што з градкі або лесу. Вой, як хочацца ў гэта верыць. Нават спытацца пра паперку аб санітарным кантролі сорамна. А раптам чалавек пакрыўдзіцца?

Фота БелТА.

— Не саромейцеся, — раіць спецыяліст. — На рынках ёсць ветэрынарна-санітарная лабараторыя, дзе праводзіцца праверка ягад і грыбоў, у тым ліку на радыяцыю. Шмат хто гэта ігнаруе. А людзі купляюць на сваю рызыку. Невядома, дзе гэта ўсё збіралася, колькі захоўвалася, як дастаўлялася. У рэшце рэшт, вы не ведаеце, ці здаровы той чалавек, у якога вы купляеце. Можа, ён на сухоты хворы або яшчэ на нешта, што перадаецца пры кантакце. А грыбы наогул у выпадковых людзей купляць нельга. Нават калі гэта вядомыя ўсім лісічкі. Вы ж не ведаеце, дзе яны збіралася. Грыбы вельмі моцна назапашваюць радыяцыю і цяжкія металы. Як паказваюць шматгадовыя даследаванні, 15 % усяго таго, што да нас прыносяць, з перавышэннем радыяцыі. Часта атручваюцца ўмоўна ядомымі грыбамі — смяротны выпадак пазалетась звязаны са страчкамі. Жалезнае правіла: не ведаеш, не бяры. У 2015 годзе на Магілёўшчыне 22 чалавекі атруціліся грыбамі, у 2016-м — 27, два з якіх памерлі, у 2017-м — 36 атруціліся, адзін памёр. У 2018 годзе лета было сухое, таму абышлося 12 пацярпелымі.

Печань з горыччу, халва з кадміем, гранатавы сок з фарбавальнікам

Нядаўна купіла пячонку траскі па смешнай цане, адкрыла, ды так і не змагла з'есці. Замест апетытнага кавалачка там камяком ляжала нейкая непрыглядная раздробленая маса.

— Апошнім часам часта сталі скардзіцца на печань траскі, — заўважае Вячаслаў Гурскі. — Але людзі самі вінаватыя. Ёсць кансервы, прыгатаваныя з толькі што вылаўленай рыбы, і ёсць з замарожанай сыравіны. Патрабаванні да свежай і замарожанай розныя. Апошняя, напрыклад, гарчыць. Затое таннейшая. Людзі, якія гэтага не ведаюць, купляюць, а потым звяртаюцца да нас. Што тут сказаць? Чытайце ўважліва маркіроўку.

Шмат паступае зваротаў па сухафруктах. Бывае, што вытворца заяўляе тавар элітнага віду, а насамрэч ідзе перасорціца. Летась была скарга на інжыр, які забрадзіў, яшчэ адна паступіла ўжо сёлета. Былі прэтэнзіі і да чарнасліву. Часта людзі трапляюць у пастку, калі купляюць прадукты па інтэрнэце або з рук. На кожны прадукт ёсць свой ДАСТ, або СТБ, або тэхнічныя ўмовы, дзе прапісаны ўсе патрабаванні да яго. І яны павінны выконвацца. На нашым сайце ёсць рэестр — пералік прадукцыі, якая не адпавядае патрабаванням і якую лепей не купляць.

Апошнім часам выяўляем кандытарскую прадукцыю з кансервантамі, якія не былі заяўлены ў маркіроўцы, — сарбінавая кіслата, бензойная. Гэта датычыцца некаторых найменняў імпартнага зефіра. А напрыклад, у халве аднаго з вытворцаў было ўстаноўлена перавышэнне кадмію — дастаткова сур'ёзнае парушэнне, бо кадмій — цяжкі метал. Зефір іншага вытворцы ўтрымліваў сярністую кіслату, але на маркіроўцы гэта не было пазначана. Гэты кансервант выкарыстоўваецца для апрацоўкі яблычнай сыравіны, але калі яго выкарыстоўваюць больш за 10 міліграмаў на кілаграм, гэта трэба ўказваць. Сустракаліся фінікі з дыяксідам серы, які нідзе не быў пазначаны. Ім звычайна апрацоўваюць садавіну для паскарэння працэсу сублімацыі. У мясных паўфабрыкатах знаходзілі кішэчныя палачкі і іншыя мікраарганізмы. Большасць з іх гіне пры тэрмічнай апрацоўцы, але ж непрыемна. Быў выпадак, калі ў гранатавым соку мы знайшлі сінтэтычны фарбавальнік — «жоўты сонечны захад». Ён не забаронены, але павінна быць папярэджанне, што дзецям да трох гадоў такі сок нельга ўжываць. З маркіроўкамі наогул шмат парушэнняў, выяўляем харчовыя дабаўкі, якія хоць і не забаронены, але іх трэба пазначаць.



Спіс забароненай да продажу прадукцыі.

На што скардзімся?

Калі летась у Магілёўскі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя за паўгода паступіла 54 звароты ад насельніцтва, то сёлета за такі ж перыяд — 65. Адна з распаўсюджаных прычын — набыццё недабраякаснай прадукцыі (скончыўся тэрмін захоўвання або тавар сапсаваўся яшчэ да таго, як гэты тэрмін прайшоў). Часцей за ўсё пад пагрозай аказваюцца каўбасныя або малочныя вырабы, садавіна і агародніна, рыба, кансервы. Пэўная частка грамадзян паведамляе пра адсутнасць спецадзення ў персаналу, парушэнне таварнага суседства (напрыклад, сырая і гатовая прадукцыя захоўваецца побач). Шэраг скаргаў датычыцца парушэнняў у рабоце абсталявання аб'ектаў гандлю або грамадскага харчавання — павышаны шум, пабочныя пахі. Ёсць і так званыя беспадстаўныя звароты. У Цэнтры згадалі выпадак, калі вялі перапіску з чалавекам на працягу аж 9(!) гадоў. Яго раздражняў павышаны шум ад абсталявання крамы і разгрузачная пляцоўка пад вакном. Уласнік гандлёвага аб'екта зрабіў закрытую разгрузачную пляцоўку, навёў парадак з халадзільным абсталяваннем, але скаржнік не супакойваўся, патрабаваў замяніць яму вокны або знайсці кватэру ў іншым раёне горада. Скарга разглядалася ў судзе, але не была задаволена. Перапіска з заяўніком таксама прыпынена, бо трапіла ў разрад беспадстаўных.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

У тэму

Намеснік начальніка інспекцыі Магілёўскай інспекцыі Дзяржстандарта Наталля ЖУКАВА:

— Праверкі паказваюць, што ў гандлі не ўсё так чыста са сродкамі вымярэння. З 2039 выбарачна правераных адзінак больш за палову вагаў не гарантавалі дакладнасць вынікаў. Парушаліся правілы карыстання вымяральнымі прыборамі пры водпуску тавараў — іх ставілі на няўстойлівыя драўляныя і кардонныя скрыні (павінна быць трывалая гарызантальная паверхня), выкарыстоўвалі бытавыя вагі, што наогул недапушчальна.

Па правілах, вагі штогод павінны павярацца ў органах дзяржаўнай метралагічнай службы. На іх, а таксама на драўляныя метры, рулеткі і іншыя сродкі вымярэння павінен быць нанесены каляровы галаграфічны знак у выглядзе налепкі. Кожны год галаграма змяняецца па колеры. Напрыклад, у 2018 годзе яна была чырвоная, а у 2019-м — зялёная. Вагі павінны стаяць так, каб спажывец бачыў гэтую галаграму.

Ну і ну!

Стаўкі напавер

Вынік — крымінальная справа і ўрон на 17 600 рублёў

Даверлівасць 34-гадовага прадаўца кіёска РУП «Белсаюздрук» у Лельчыцах пацягнула буйны ўрон для прадпрыемства. Жанчына прымала стаўкі ад 30-гадовага жыхара раёна, аднак грошы за ўдзел у інтэрактыўных гульнях ад яго не атрымлівала. У выніку праз электронны тэрмінал «бясплатна» прайшлі шматлікія аперацыі на суму 17 600 рублёў, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.

Пра ўрон стала вядома, калі работнік кіёска сыходзіла ў дэкрэтны адпачынак. Пры прыёме-перадачы спраў рэвізійная камісія выявіла парушэнні, пра якія паведаміла праваахоўнікам. Як устанавілі аператыўнікі, у кіёску мужчына рэгулярна рабіў стаўкі, у тым ліку буйныя. Пры гэтым да пэўнага моманту праблемы з аплатай паслуг у яго ніколі не ўзнікала. Мяркуецца, што фінансавая стабільнасць мужчыны, у тым ліку буйныя выйгрышы, падкупіла прадаўца, і ў далейшым па просьбе кліента яна пачала прымаць стаўкі «на вэксаль».

Мужчына абяцаў вярнуць грошы ў касу, як толькі латарэя акажацца выйгрышнай. Аднак гэтага так і не адбылося, нягледзячы на наяўнасць удалых ставак. У дачыненні да мужчыны заведзена крымінальная справа за прычыненне маёмаснай шкоды без прыкметаў крадзяжу, здзейсненае ў буйным памеры. Раней грамадзянін прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзеж і палавыя зносіны і іншыя дзеянні сексуальнага характару з асобай, якая не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту.

Скраў матацыкл і адразу ж прадаў знаёмаму

Гісторыя здарылася ў вёсцы Кімія Барысаўскага раёна. Два аднавяскоўцы познім вечарам вырашылі зладзіць застолле і, каб не губляць час, па спіртное адправіліся на матацыкле аднаго з мужчын. Вярнуўшыся з крамы, уладальнік чамусьці не стаў ставіць транспартны сродак у двор свайго дома, а прыхаваў непадалёк.

Як паведамляе Барысаўскі РУУС, назаўтра мясцовы жыхар не знайшоў ні сябра, ні матацыкла. Мужчына быў упэўнены, што менавіта ўчарашні сабутэльнік датычны да знікнення, і разлічваў дамовіцца аб вяртанні маёмасці. Але 24-гадовы прыяцель пасля інцыдэнту на сувязь выходзіў неахвотна, а на пытанні, дзе матацыкл, адказваў няпэўна.

У выніку праз месяц уладальнік вымушаны быў звярнуцца па дапамогу ў праваахоўныя органы. І сапраўды, здагадкі мужчыны пацвердзіліся: угоншчыкам быў той самы аднавясковец. Малады чалавек прызнаўся ў зробленым і расказаў, што ідэя выкрасці матацыкл у яго ўзнікла спантанна. Крадзенае зламыснік неўзабаве прадаў сваім знаёмым за сімвалічную суму, а атрыманыя грошы выдаткаваў на свае патрэбы.

Скрадзены матацыкл канфіскавалі і вярнулі ўладальніку. У дачыненні да падазраванага распачата крымінальная справа, яму пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі.

Страцілі і сябра, і грошы

Ашуканскім шляхам 22-гадовы мінчанін заваладаў такой сумай цягам года, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама.

У міліцыю звярнуўся адзін з падманутых. Малады чалавек паведаміў, што яго таварыш завінаваціўся яму тры тысячы долараў і не жадае іх аддаваць. Як аказалася, 22-гадовы зламыснік пазычыў грошы ў свайго сябра нібыта на адкрыццё бізнесу і паабяцаў, што як толькі «раскруціць» сваю справу, адразу ж верне доўг. Для пацярпелага спакуса была вялікая — «бізнесмен» паабяцаў вярнуць доўг у двайным памеры. Але грошай пацярпелы так і не дачакаўся.

Праваахоўнікі ўстанавілі, што на «вуду» 22-гадовага мінчаніна трапіла ледзь не ўсе атачэнне зламысніка. Як аказалася, малады чалавек на розных падставах, у тым ліку і на лячэнне маці, прасіў грошы ў сваіх знаёмых, пасля чаго ладзіў сабе шыкоўнае жыццё. Грошы зламыснік выдаткаваў на казіно, гульнявыя аўтаматы і рэстараны. Агулам малады чалавек завінаваціўся сваім таварышам каля дзесяці тысяч долараў.

Затрыманы раней ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзеж. Атрыманыя ад продажу грошы таксама прайграў у казіно.

Сяргей РАСОЛЬКА.